Выдаецца
з чэрвеня 1924 года

# Народная асвета

**Штомесячны навукова-педагагічны часопіс**

Заснавальнік:
МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Галоўны рэдактар А. В. МАСЛАВА**

**Рэдакцыйная калегія:**
Б. А. ГАПАНОВІЧ
Н. І. ДАБРАГОСТ
Г. Дз. ДЫЛЯН
У. Т. КАБУШ
Т. М. КАВАЛЁВА
З. А. ЛЫСЕНКА
(намеснік галоўнага рэдактара)
Г. М. ПЯТРОЎСКІ
І. С. СКАРАПАНАВА
В. У. ЧЭЧАТ
К. С. ФАРЫНО

**Навуковыя кансультанты:**
Г. А. БАРТАШЭВІЧ
Т. М. БУЙКО
К. У. ГАЎРЫЛАВЕЦ
А. І. ЖУК
А. І. КУЧЫНСКІ
А. Ц. КУЗНЯЦОЎ
Л. В. ЛУЦЭВІЧ
А. Г. СЛУКА
В. А. САЛЕЕЎ
А. І. ТАЎГЕНЬ
Н. А. ЦЫРКУН

**Паважаныя падпісчыкі, аўтары і чытачы “Народнай асветы”!**

Пры фарміраванні каталога на II паўгоддзе Рэспубліканскім аб’яднаннем “Белпошта” дапушчана памылка: перыядычнасць выхаду нашага часопіса заяўлена 1 раз у два месяцы. Зараз памылка выпраўлена, і, нягледзячы на фінансавыя цяжкасці, часопіс будзе выходзіць штомесячна. Запрашаем Вас прадоўжыць падпіску на “Народную асвету” на IV квартал і запэўніваем, што Вашы выдаткі будуць кампенсаваны найлепшымі і якаснымі матэрыяламі па актуальных праблемах і новых аспектах жыццядзейнасці школы, ВНУ, сістэмы павышэння кваліфікацыі, метадычнай службы ў сістэме адукацыі. У бліжэйшых нумарах анонс новых рубрык “Школьная субота”, “Сямейны праект”, “Факультэт здароўя”.

*Да ведама аўтараў. Просім, па магчымасці, разам з рукапісамі дасылаць і дыскеты, вяртанне якіх гарантуецца.*

**Сябруйце з “Народнай асветай”!**

Рэдакцыя.

**9/2002**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ІНСТЫТУТ ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ І ПЕРАПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ БДПУ

***А. І. АНДАРАЛА,***
***дырэктар Інстытута, кандыдат педагагічных навук,***

***В. У. ЧЭЧАТ,***
***прарэктар па навуковай рабоце Інстытута, доктар педагагічных навук***

Сёння паслядыпломная адукацыя педагагічных кадраў уяўляе сабой сукупнасць абласных, гарадскіх інстытутаў удасканалення настаўнікаў, якія існуюць пры адпаведных упраўленнях адукацыі, а таксама інстытутаў і факультэтаў павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў пры ВНУ.

Функцыю паслядыпломнай адукацыі ў БДПУ доўгі час выконвалі спецыяльныя факультэты, якія ажыццяўлялі перападрыхтоўку настаўнікаў-дэфектолагаў і практычных псіхолагаў. Агульная колькасць слухачоў на іх складала 125 чалавек. Правапераемнікам гэтых спецфакаў у верасні 2000 года стаў факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў сістэмы адукацыі. Стварэнне факультэта было абумоўлена неабходнасцю і жаданнем універсітэта больш актыўна і дзейсна адгукацца на патрэбы сучаснай школы.

На базе факультэта павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў сістэмы адукацыі ў ліпені 2001 г. быў створаны **Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў.** Ён з'яўляецца структурным падраздзяленнем Установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка" і ажыццяўляе вучэбную, навуковую і арганізацыйна-метадычную работу па павышэнню кваліфікацыі і перападрыхтоўцы кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі, прыватных грамадзян, а таксама з'яўляецца вучэбна-метадычным цэнтрам па вывучэнню і прапагандзе дасягненняў псіхолага-педагагічнай навукі і практыкі.

У складзе Інстытута функцыяніруюць два факультэты: перападрыхтоўкі спецыялістаў адукацыі і павышэння кваліфікацыі спецыялістаў адукацыі.

***Задачы і напрамкі дзейнасці Інстытута:***

— перападрыхтоўка кіруючых работнікаў і спецыялістаў сістэмы адукацыі ў адпаведнасці з патрэбамі міністэрстваў, ведамстваў, прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў, асобных грамадзян у атрыманні новай прафесіі;

— павышэнне кваліфікацыі прафесарска-выкладчыцкага саставу БДПУ, вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь;

— павышэнне кваліфікацыі кіруючых кадраў і выкладчыцкага саставу сярэдніх спецыяльных педагагічных навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь; падрыхтоўка рэзерву кіруючых работнікаў для вучэбна-выхаваўчых устаноў сістэмы адукацыі;

— арганізацыя і кіраванне стажыроўкай слухачоў у вядучых навучальных і навуковых установах;

— распрацоўка нарматыўна-прававой і вучэбна-метадычнай дакументацыі, сучасных ме-



Пасяджэнне савета Інстытута.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тадаў і тэхналогій навучання, стварэнне базы даных аб кіраўніках, спецыялістах, педагогах-даследчыках сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь;

— развіццё сувязей з айчыннымі і замежнымі вучэбна-метадычнымі і навуковымі цэнтрамі ў галіне перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі, вывучэнне дасягненняў сусветнай псіхолага-педагагічнай і метадычнай навукі, інавацыйнай практыкі навучання, выхавання, бесперапыннай адукацыі.

У дзейнасці Інстытута акрэсліліся два асноўныя напрамкі. Першы — перападрыхтоўка педагагічных кадраў з ліку асоб, якія маюць вышэйшую адукацыю (з адрывам і без адрыву ад працы). Важнае месца займае перападрыхтоўка настаўнікаў-дэфектолагаў, практычных псіхолагаў, сацыяльных педагогаў, настаўнікаў замежнай мовы. Другі напрамак дзейнасці — павышэнне кваліфікацыі спецыялістаў адукацыі, да якіх адносяцца выкладчыкі педагогікі, псіхалогіі і прыватных методык ВНУ, кіруючыя работнікі і выкладчыкі дашкольных, пачатковых аддзяленняў, аддзяленняў беларускай мовы і літаратуры, музыкі і спеваў педагагічных каледжаў і педагагічных вучылішчаў, выкладчыкі музыкі школ з музычна-эстэтычным ухілам г. Мінска і Мінскай вобласці.

У 2002 г. на факультэце перападрыхтоўкі спецыялістаў адукацыі навучалася 444 слухачы па 5 спецыяльнасцях: практычная псіхалогія (дзённае навучанне), практычная псіхалогія (завочнае навучанне), дэфекталогія (завочнае навучанне), англійская мова (вочна-этапнае навучанне), сацыяльная педагогіка (завочнае навучанне), прафесіянальнае навучанне (вячэрняе навучанне). На факультэце павышэння кваліфікацыі спецыялістаў адукацыі на працягу 2002 г. павысяць кваліфікацыю каля 700 слухачоў.

Вылучаюцца наступныя катэгорыі слухачоў: 1) загадчыкі кафедраў педагогікі, псіхалогіі і прыватных методык ВНУ рэспублікі; 2) выкладчыкі педагогікі і псіхалогіі вышэйшых непедагагічных навучальных устаноў г. Мінска; 3) дырэктары педагагічных каледжаў і педагагічных вучылішчаў; 4) старшыні цыклавых камісій па педагогіцы і выкладчыкі педагагічных каледжаў і вучылішчаў; 5) настаўнікі спецыяльных школ "Адаптыўная фізкультура"; 6) настаўнікі лячэбнай фізкультуры ўсіх тыпаў спецыяльных школ-інтэрнатаў і цэнтраў карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі.

Мэтавыя курсы для розных катэгорый слухачоў маюць сваю тэматыку (гл. табл.).

| Катэгорыі слухачоў | Тэматыка мэтавых курсаў |
|---|---|
| Дырэктары педкаледжаў і педвучылішчаў | Пераемнасць сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай педагагічнай адукацыі |
| Старшыні цыклавых камісій па педагогіцы | Змест, формы і метады педагагічнай падрыхтоўкі выхавальнікаў дашкольных дзіцячых устаноў. Змест, формы і метады педагагічнай падрыхтоўкі настаўнікаў пачатковых класаў |
| Выкладчыкі матэматыкі педвучылішчаў і педкаледжаў | Асноўныя напрамкі ўдасканалення матэматычнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў пачатковых класаў у сістэме "Педкаледж — педуніверсітэт" |
| Выкладчыкі беларускай мовы педвучылішчаў і педкаледжаў | Пераемнасць зместу адукацыі па беларускай мове ў сістэме "Педкаледж — ВНУ" |
| Выкладчыкі музычных дысцыплін і методыкі музычнага выхавання | Тэарэтычныя падыходы да пабудовы зместу адукацыі па музыцы і методыцы выкладання музыкі і спеваў з улікам пераемнасці ў сістэме "Педвучылішча — педкаледж — педагагічная ВНУ" |
| Настаўнікі лячэбнай фізкультуры ўсіх тыпаў спецыяльных школ-інтэрнатаў і цэнтраў карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі | Лячэбная і аздараўленчая фізічная культура |
| Настаўнікі фізічнага выхавання спецыяльных школ | Адаптыўная фізічная культура |

***Перспектывы развіцця Інстытута.*** У бліжэйшыя гады плануецца ўвядзенне на факультэце перападрыхтоўкі спецыялістаў адукацыі новай спецыяльнасці — "Менеджэр у сферы адукацыі". З кантынгенту слухачоў, выкладчыкаў і метадыстаў Інстытута будзе праводзіцца набор у магістратуру, аспірантуру, дактарантуру.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ